# КРАЯЗНАВЕЦ, У ЯКОГА НЯМА АДПАЧЫНКУ

На пачатку сакавіка цікавая сустрэча адбылася на гістарычным факультэце. Да студэнтаў-гісторыкаў першага курса завітаў настаўнік з Міёршчыны, апантаны краязнавец Вітольд Антонавіч Ермалёнак.

Вітольд Антонавіч ужо больш за сорак год працуе настаўнікам гісторыі ў Міёрскай сярэдняй школе № 3. Прычым ён не проста выкладае прадмет, але і сур'ёзна займаецца краязнаўчай працай. Пад кіраўніцтвам Вітольда Ермалёнка пры школе працуе краязнаўчы гурток «Арганаўты мінулага», у склад якога ўваходзяць вучні, што неабыякава ставяцца да гісторыі роднага краю. Разам са школьнікамі Вітольд Антонавіч ладзіць пешыя і велапаходы па Віцебскім рэгіёне, збірае цікавыя легенды і паданні, адшуквае ўнікальныя экспанаты для аднаго з трох музеяў, створаных настаўнікам.

Дзякуючы Вітольду Антонавічу пры школе працуе гістарычны музей (адкрыты ў 1986 годзе), музей кнігі і друку (2006) і этнаграфічны музей «Сялянская хата» (2015). У хуткім часе краязнавец плануе адкрыць музей асветы.

Фонды трох музеяў налічваюць больш за 30 тысяч самабытных экспанатаў, у кожнага з якіх свая гісторыя.

«Я заўсёды раю сваім вучням уважліва глядзець пад ногі, а не ўгару, – адзначыў падчас сустрэчы Вітольд Ермалёнак, – бо ніколі не ведаеш, што табе можа патрапіцца на шляху».

І гэта сапраўды так. Напрыклад, рымскую манету 280 г. н.э. Вітольд Антонавіч знайшоў на асфальце, калі чакаў на прыпынку аўтобус. Хутчэй за ўсё яна была «прынесена» з поля адным з камбайнаў, якія ў той час па шашы вярталіся на базу.



Знаходка такога кшталту манет на тэрыторыі Беларусі ў чарговы раз даказвае, што, дзякуючы шляху «з варагаў у грэкі», часткай якога з'яўлялася і наша Заходняя Дзвіна, мы мелі гандлёвыя зносіны з краінамі Еўропы.

Зразумела, што не ўсе экспанаты музеяў былі знойдзены вось так выпадкова. Адны настаўнік набываў за грошы, другія ж зарабляў сваім потам і крывёй. Напрыклад, за адны кнігі Вітольд Антонавіч амаль усё лета дапамагаў суседкам па гаспадарцы: абкошваў пожні, пераворваў агарод, сек дровы. А калі тыя прапаноўвалі разлічыцца за працу самагонкай – адмаўляўся, маўляў, дайце лепш за працу кнігі (краязнавец ведаў, што ў суседскай сям'і захоўваліся рэдкія выданні).

А за некаторую літаратуру, якая сёння экспануецца ў школьным музеі кнігі і друку, Вітольд Ермалёнак наогул заплаціў крывёю:

«Аднойчы, вяртаючыся ў Міёры з Друі, я стаяў на прыпынку і чакаў аўтобуса, як заўважыў, што на адным з падвор'яў нейкі дзед расклаў цэлае вогнішча са старых кніг і ўсё падкідваў ды падкідваў новыя, – распавядаў студэнтам Вітольд Антонавіч. – Часу раздумваць не было, я кінуўся ў агонь і голымі рукамі пачаў выцягваць кнігі. Згарэлі рукавы кашулі, палопалася скура на руках, і пачалі крывавіць апёкі. Аднак я не спыніўся». Тады Вітольду Ермалёнку ўдалося выратаваць з агню некалькі цікавых выданняў, у тым ліку кнігі Адлера – аптэкара з Друі.

Сваю зацікаўленасць да краязнаўства і апантанасць гісторыяй роднага краю Вітольд Антонавіч прывіў вучням. Пра гэта можа сведчыць, напрыклад, выпадак, расказаны Вітольдам Антонавічам:

«Аднойчы мой былы вучань, які служыў у арміі, бег марафон з поўнай выкладкай. І раптам убачыў пад нагамі нейкую рэч (як аказалася потым, гэта была старажытная прылада працы), спыніўся і, пакуль акуратна не раскапаў яе сапёрскай рыдлёўкай, далей не пабег».

Расказваў Вітольд Антонавіч гісторыкам і іншыя цікавыя выпадкі са свайго жыцця. Як аказалася, В.А. Ермалёнак ведае свой радавод да 20 калена: памяць аб продках у яго сям'і перадаецца з пакалення ў пакаленне, ад бацькі да сына.

З будучымі настаўнікамі гісторыі госць з Міёршчыны падзяліўся сакрэтамі педагагічнага майстэрства, расказаў, як наладзіць кантакт з вучнямі, зацікавіць іх гісторыяй і краязнаўствам. Студэнты-гісторыкі былі ў захапленні ад госця, з ахвотай задавалі яму пытанні, прасілі сфатаграфавацца.

«Памятайце, – сказаў напрыканцы сустрэчы Вітольд Ермалёнак студэнтам, – краязнаўцы не ходзяць у адпачынак. Калі вы абралі гэтую прафесію, то яна павінна стаць вашым жыццём».

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**